Дзяржаўная  ўстанова адукацыі
«Відзаўская дзіцячая школа мастацтваў»
Адрас: 211990
Віцебская вобласць, г.п. Відзы, вул. Чырвонаармейская, 19
Кантактныя тэлефоны: 8 (02153) 28-6-76
Электронны адрас: vidzi-dshi@mail.ru
рэжым працы: панядзелак-пятніца 8.00 - 19.30.
субота 8.00-16.00
выхадны дзень: нядзеля.

Дырэктар – Шніп Вольга Міхайлаўна

Дзяржаўная ўстанова адукацыі «Відзаўская дзіцячая школа мастацтваў» з'яўляецца ўстановай дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі, якае рэалізуе адукацыйную праграму мастацкага профілю ў сферы культуры. Навучанне ў школе ажыццяўляецца ў індывідуальнай і групавой форме на платнай аснове.

ДУА «Відзаўскі дзіцячая школа мастацтваў» мае ў сваёй структуры адасобленае падраздзяленне: Казянский філіял.

Адукацыйны працэс у ДУА «Відзаўская дзіцячая школа мастацтваў» забяспечвае 7 настаўнікаў, з іх – 2 настаўнікі з вышэйшай адукацыяй, 1 чалавек вучыцца завочна ў вышэйшай навучальнай установе. У школе навучаецца 70 вучняў.

Навучанне вядзецца па кірунку «музычнае»: інструментальнае аддзяленне (клас баяна, акардэона, цымбал, фартэпіяна).

Прыём асоб у дзіцячую школу мастацтваў, ажыццяўляецца ва ўзросце 6-9 гадоў пасля правядзення праверкі здольнасцяў прыёмнай камісіяй.

Відзаўская школа мастацтваў аказвае дадатковыя платныя паслугі насельніцтву і мае ў сваім складзе разліковыя структурныя падраздзяленні:

1. Падрыхтоўчая група, у якую прымаюцца дзеці ва ўзросце 5-6 гадоў па ўсіх напрамках дзейнасці на групавую і індывідуальную форму навучання.

2. Курсы агульнага музычнага развіцця, для жадаючых любога ўзросту, навучыцца ігры на музычных інструментах (без узроставых абмежаванняў).

Дадаткова Відзаўская школа мастацтваў аказвае платныя паслугі:

1. Пракат музычных інструментаў;

2. Арганізацыя канцэртаў і танцавальна-забаўляльных праграм для дзяцей;

3. Музычныя прадстаўленні (казкі, спектаклі).

У ДУА «Відзаўская дзіцячая школа мастацтваў» працуюць творчыя калектывы: вакальныя групы «Anima sonis» і «Delis», інструментальныя ансамблі; з ліку настаўнікаў – інструментальны ансамбль «Натхненне», дуэт піяністаў.

У мэтах развіцця міжнароднага супрацоўніцтва ў сферы культуры, на падставе дагавора аб супрацоўніцтве ад 28.11.2014 ДУА «Відзаўская дзіцячая школа мастацтваў» (Рэспубліка Беларусь) цесна супрацоўнічае з Шпогскай Музычнай і мастацкай школай Даўгаўпілскага краю (Латвійская Рэспубліка, пасёлак Шпогі).